ГОД ВЫДАН. III. **Przesyłka pocztowa opłacona ryczałtem** ЦАНА 30 ГРОШ.

Маланка

ЧАСОПІСЬ ГУМАРУ, ЖАРТАЎ І САТЫРЫ

20. I. 1928 „МАЛАНКА" СМАЛІЦЬ ШТО ДВА ТЫДНІ! № 1


Ціха, дзеткі, ціха!..


Паўлюкевіч і Умястоўскі, ня гледзячы на сваё палёнафільства, пачалі ўзаемна лаяцца ў сваіх газэтах.

(З газэт).



Матка-полька *(да сваіх гадунцоў)*: Ціха, вы смаркачы, бо вось плескача дам! — Аднэй маткі малачко сьсеце, дык павінны жыць згодна і пакорна...





Вось гэтыя мандаты спакою не даюць!..

Эх, чаму я не „пястовец“,
Не „радыкал“, ні „пэпэсовец“,
Ні „санатар“, ні „эндэк“,
Ні „сельсаюзьнік“, ні „хадэк“!..
Навет я ня маю głosu...
(Не зайздрошчу свайму лёсу!).
Вось каб быў-бы я паслом,
Пайшло-б ліха хадыром!..
Зараз быт свой перайначыў:
Купіў-б хату, зямлю, дачу, —
Быў-б сабе вяльможны пан,
Дачцэ купіў-бы — фартэп'ян,
Жонцы футраў і спадніцаў,
Махнуў-б летам за граніцу.
І на пляжы там, ля мора
Я забыўся-б пра выборы,
Бо меў-б мандат на гадоў пяць, —
Мне на выборцаў напляваць!..
Дык чаму я не „пястовец“,
Не „радыкал“, ні „пэпэсовец“,
Ні „санатар“, ні „эндэк“,
Ні „сельсаюзьнік“, ні „хадэк“,
Але запісаны да чорнай лісты,
Бо я... — быўшы „грамадзісты“, —
Калі што... садзісь за краты
І ня думай пра мандаты...



Янка Маланка



Х Кажуць, што б. п. Ярэма, ў выпадку ўдачных для яго выбараў, загадае раздаць бяз выкупу ўсю зямлю, якая толькі ёсьць на ўсім сьвеце, але для сябе асабіста купіць за даляры валок з пяток.


Х Кажуць, што віленскі „Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры“ раздае пасольскія мандаты толькі сваім сільнейшым фізычна сябром, дзеля чаго ў часе спатыканьня сёлетн. Новага Году ў кватэры Інстытуту адбылася гэнэральная бойка. Былі пабітыя (але не забітыя) і раненыя, а навет... заплаканыя.

Х Кажуць, што эсэр Мамонька, абіджаны тым, што ніхто не адклікнуўся на яго „Покліч“, мае пакінуць няўдзячную Заходнюю Беларусь. Дзеля гэтай мэты навязаў кантакт з эсэрамі на Марсе і ў хуткім часе рыхтуецца туды выэміграваць, дзе праўдападобна будзе яму даручана пасада дырэктара дзяржаўных сьпіртных манаполяў.

Х Кажуць, што б. пасол Шапель, вядомы сваімі гіганцкімі крокамі з партыі да партыі, пасьля свайго зьезду рашыў купіць сабе лапці, сярмягу і сялянскую шапку, а гэта дзеля таго, каб спрытней ашукваць сялян.

Х Кажуць, што бацька „Беларускай“ Радыкальнай Партыі Умястоўскі, ня маючы казённай круцёлкі, як Паўлюкевіч, усё-ж такі круціць... пэнсіі сваім працаўнікам, асабліва агітатарам.

Каля Беластоку.



— У нас агітавалі з N. P. R. (Незалежн. Работн. Партыі), дык мы іх высьвісталі.

— А ў нас былі „Пэпээсы“, дык мы іх за дзьверы выкінулі.

„Поэту“ Акіму Сухарскаму.

...Мову родную хто
Пазабыў, асьмяяў,—
Загубіў за нішто, —
Каб ён сьвету ня знаў!..

Г. Леўчык.

Пакінь салодкія лятункі,
Ўжо „*недѣлимой*“ не вярнуць...
Жыцьцё зьвяло з ёй парахункі.
Пакінь салодкія лятункі,

Бо нагароды не дадуць!
Краса вясны — твае пястункі
Ўжо адцьвіла, дык, браце, знаеш:
Пакінь салодкія лятункі!

Ты мовай нашай пагарджаеш,
Ты — беларус о, мой „поэце“,
Ціж мала йшче ў старонцы нашай
Жыцьцём ня зьнішчанага смецьця.

Акімку! ўсім, што ня любілі,
Што адракліся роднай мовы, —
У падзяку кол, братко, здаровы
Ўваткнуць з асіны на магіле...

Пішы, „поэт“, дасягнеш славы,
Ляці-ж ў чужым табе бязьмежжы.
Ўжо карабель яе дзіравы
Даўно чакае на ўзьбярэжжы
Жыцьця, жаданага табой.
Пішы, Якімку, ўбогі мой!..

М. Васілёк.

Ад рэдакцыі: Усяму таму сьмяцьцю, якое яшчэ засталося на нашай Беларусі, ў тым ліку і невядомаму „расейскаму песьняру“ з Горадзеншчыны, Якіму Сухарскаму, гэты верш прысьвячаецца.

„*Маланка*“.

ТУПЫ НОЖ.

Дачка прыехала да бацькоў на сьвяты. Быўшы ў месьце, яна навучылася некаторых культурных манераў, а дзеля таго любіла зварочваць увагу сваім бацьком, што культурна, а што някультурна.

— Татачка! гэта-ж страх... ня можна есьці нажом!..

— Ня бойся, дачушка, ён тупы!..

„Зиз“.

ЦЯЖКІ ЧАС.

Матка да дачкі:

— За каго ты, Марылька, хацела-б выйсьці замуж: за блёндына, ці за брунэта?

— Э, дзе там разьбіраць! У сучасным цяжкім часе не адмовілася-б і ад лысага.

Я. М.

Стары спосаб.

Раз у вечар да Ігната
Сабралося шмат жанчын, —
(Як гарбуз, набіта хата),
А з імі з паўкапы мужчын.
Бабы—з прасьніцай, вядома,
Ці з панчохамі ідуць;
Мужыком-жа нудна дома,
Дык... за бабамі бягуць.
Пры кудзелі ў баб работа:
Верацёны—аж бурчаць.
Пры тым паслухаць ўсім ахвота,
Дзе на сьвеце што чуваць.
Тут наш Янка бабам чмуціць,
Што ў газэтах стаіць так:
(Хоць ня мала й перакруціць,
Бо на гэта ён мастак).
Што сучасная навука
Перавернець усё дном, —
Ўсё на сьвеце (вось дык штука!)
Хутка пойдзе хадыром.
—„Мусіць, вы яшчэ ня чулі?“
Янка кажа: „вось манер!
Кураняткі ўжо бяз куры
Можна вывесьці цяпер.
А навука далей прэцца
І, ў газэтах ёсьць, чутно,
Новым спосабам ўдаецца
Адтрымаць ажно цялё.
А яшчэ цьвярдзіць навука,
І паверыць можна
А нядаўна ўжо машыну
Адкрыў нейкі дабрадзей,
Што пановаму без жанчыны
Будуць размнажаць людзей“...
Аж тут раптам маладзіцы:
— „Што ты, Янка?!—ўсе крычаць:
Мы-ж не каровы й ня курыцы, —
Не дамося ашукаць!...
Хай нас садзяць у вастрогі,
Хай нас рэжуць,—зьнясём болі!—
Але... ад спосабу старога
Мы не адступімся ніколі!!

Улад.—Ініцкі.

СТАРАННЫ.

Бацька да сына:

— Даў каню аўса?

— Даў.

— А ці напаіў?

— Але.

— Дык запрагай яго, у млын паедзем.

— Але-ж я ня ведаю, дзе конь ёсьць.

ДОБРЫ МУЖ.

Жонка: — Ах ты п'яніца, гультай! Зноў прыходзіш дамоў раніцай. Ці-ж гэта добра? Скажы, што-бы ты рабіў, каб я гэтак позна прыходзіла?

Муж: Нічога, ні-ні-чога. Сказаў-бы: ідзі, маё золатца, спаць.

Г. Г.

Тры Каралі у Заходняй Беларусі



(**Б. паслы — Ярэміч, Рагуля і сэн. Багдановіч**). Пяць гадоў быцьця нашага ў Сойме ў адзін момант прайшло, навет і не нацешыліся. Вось, каб яшчэ раз у Сойм, ці ў Сэнат прайсьці, тагды-б мы падарункаў беларускаму народу не пашкадавалі-б...

ЦЫГАН ЗАВАРАЖЫЎ.

Прыйшоў цыган да селяніна і просіць:

— Дай, бацька, сала!

— Ідзі касіць, дык дастанеш сала і да сала.

— Добра.

Пайшоў цыган на сенажаць. Пабыў там да вечара, а за касу на'т ня браўся, толькі ўсяго і працы, што ўсё сала сьпітляваў.

Вярнуўся вечарам цыган да гаспадара і йзноў просіць:

— Дай, бацька, яшчэ сала, каб трава ня ўстала.

Гаспадар адмовіў.

— Ну, не даеш сала, каб-жа табе трава ўстала! — сказаў адходзячы цыган.

На другі дзень пайшоў гаспадар на сенажаць, аж там уся трава стаіць ня кошаная.

Уздыхнуў цяжка селянін, ды кажа:

— Пашкадаваў учора сала, — вось і трава ўстала!

Ш.

ХТО З ЧЫМ..

Паслы ў Сойм павінны ісьці з сваімі профэсіянальнымі прыладамі. Гэтак: поп — з крыжам, ксёндз — з кантычкай, Ярэміч — з лятарняй (мусіць пад вокам), Рагуля — вядома, з рагамі, а „доктар" (пэўне Паўлюкевіч) — з... клістырамі. Бзд...

Перадвыбарныя здарэньні.

Будуць выбары!

Усё арганізуецца.

Толькі вось нашаму брату — фэльетоністаму проста немагчыма якую-небудзь партыю скамбінаваць.

Дый дзе ўжо там партыю?!

Хоць-бы арганізацыю сваю прафэсіянальную якую склеіць...

Быў, праўда, „Веснаход" мінулаю вясною закладзены, але недзе разам з тэю самаю вясною ў нябыцьцё, пасьля досіць доўгага, як той казаў — „анабіозу" (паўсьмерці) адыйшоў.

А бяда „неарганізованаму" чалавеку ў наш час.

Ніяк у людзі ня вылезеш.

Асабліва ў... паслы, у Сойм, значыцца, або ў сэнатары—ў Сэнат.

Ёсьць крыху падобнае нешта— гэта *санатар.*

Так! так! ня сэнатар, а *сана*тар.

Ад гэтае самае санацыі, значыцца.

Гэтым вось вялікім чалавекам-санатарам зрабіцца шмат лягчэй:

Залажыў сякую-такую „хатку", пусьціў ігру *сьветльно-калёровую*—

Тут табе зараз і грошы, і газэта свая з раешнікамі, з ілюстрацыямі, з пашквілямі на ўвесь беларускі рух.

І адразу, пасьля гэтага, розныя паны „naprawiacze" ды „sanatory" з моднае сягоньня „Партыі Працы" падхопяць:

— Да нас, да нас, хлопча! Гайда разам на беларусаў! Ня даць ім ходу на выбарах.

А так, бяз усіх гэтых клюбна-хатачных камбінацыяў, сягоньня ў „беларускія дзеячы" няма дарогі.

Дый жыцьця, проста, няма...

Гэтак разважаючы, я глянуў у вакно.

Няшчасьце!

Адліга на дварэ пачынаецца, а башмакі мае даўно трэбуюць сабе ня толькі што санацыі капітальнае, а проста ўжо поўнае замены на новыя.

— Што рабіць? — хапаюся за галаву.

— Трэба ляцець да знаёмага майстра-шаўца, пакуль на вуліцы ад „працэкцыі" ў падноcках катару не злавіў. Можа паверыць, ды на вэксаль пашые?..

На Вялікай вуліцы, каля кіна „Пікадзілі", бачу магутная фігура з чырвоным носам прэцца насустрэчу.

І наляцеўшы каршуном ня мяне, крычыць:


— *Измена! измена!..*

— Што бязьмен?.. Які бязьмен? — пытаюся, адвыкшы ад расейскае мовы. А дзядзька мне сыпле:

— Ды не бязьмен—таўкач ты,— а *измена, понимаешь?..*

— Ага! значыцца здрада... дзяўчына здрадзіла, гэтая самая вя-

Ня ўсякі вытрывае.




Аглядчык: — Скажэце, а клапоў тут няма?
Жыхар: — Даруйце! Клоп—ці-ж ён у такіх варунках выжыве? Ён — стварэньне слабое, дзе яму!

АДЗІН ДРУГОГА ЛЕПШЫ.

— У мяне быў адзін знаёмы, які і ў цемнаце бяз лямпы чытаць мог.

— Э, гэта нічога дзіўнага! Вось наш начальнік пошты дык закрыты ліст праз канвэрт пазнае, ці ёсьць даляры, ці не.

Ня дай і ня лай!



— Дзядзечка! — дайце на міласьць Боск...
— Пашоў к чорту!
— Вось, сьцерва, і даказаць не дае.



ЗАСЛУЖАНЫ.

— Кажуць, што наш павятовы стараста дастаў ужо трэйцюю мэдалю...

— За што?

— Трэйцюю дастаў за тое, што меў ужо дзьве; другую — за тое, што меў адну, а першую — за тое, што ня меў ніводнай.

Госьць, а разумее.



— Другая сьвіньня прыдзе ў госьці і наровіць, каб дзе на абрус, або сярод хаты... А я сваё месца ведаю — заўсёды ў куток.

(З радавага гумару).

ДОБРАЯ РАДА.

— Даражэнькі сынок! калі хочаш быць шчасьлівым, дык сьцеражыся карчмы, картаў і распусты.

— Так, татачка! Але-ж мяне ў школе вучылі, што трэба заўсёды з бацькоў прыклад браць.

сковая, румяная, блёндынка, што карты ў лёта прадаваць выпісаў, а пасьля сабе да хаты забраў?..

— *Грандіозная измена*... здрада! — крычыць мой „дзеяч". — 2.000 чалавек ува ўсіх пяцёх арганізацыях Павлюкевічэ разам было... І толькі 400 цяпер засталося. Але й тыя могуць здрадзіць!

Я нічога ня мог зразумець.

Перада мною стаяў з усіх бакоў *„быўшы чалавек"*:

Быўшы беларускі міністар — раз.

Быўшы „душа" аднае провінцыяльнае гімназіі — два.

Быўшы *статскій советник* — тры.

Быўшы прыяцель Пурышкевіча, Маркава 2-га, графа Коновніцына, Дубровіна, Гамзей-Гамзеіча і г. д.

Чорт яго і пералічыць усё тое, чым гэты чалавек быў.

Я выцягнуў да яго руку, каб разьвітацца, шануючы беларускім звычаем яго паважны на нашыя часы дзядоўскі век.

— Куды? як-жа жывеш?—затрымлівае ён.

— Іду да шаўца,—адказаў я,—а жыву вось, як бачыш.

„Дзеяч" мой падняў акуляры на лоб і утаропіўся мне ў ногі:

— Што ты? цяпер у гэтых башмакох? З павуціны? — зьдзівіўся ён.

— Як бачыш! Але новыя закажу, скураныя, — адказаў я.

— А, цюцік! стрэліў недзе грошы... на выбары... агітаваць хочаш? Ня лезь! Заляпісуюць!.. А ў нас усё-ж такі здрада:

Уся Палачанская воласьць з партыі, з нацыянальнае рады, з „Прасьветы" зусюль, зусюль начыста ўцякла. Тысяча шэсьцьсот чалавек адразу дый яшчэ з войтам, з Пятровічам на чале, з гэтым, што на зьезьдзе самаўрадаўцаў у „Хатцы" старшынёю быў.

— Гэта мяне ня цікавіць, — спакойна адказваю.

— Ага! ня цікавіць? А нам хоць Лазара сьпявай!.. *Нельзя, ничего нельзя тут дѣлать, понимаешь?* — перайшоў быўшы чалавек на лягчэйшую для яго мову.

— *Вот в Россіи*, дык праўдзівае аздараўленьне будзе... калі толькі пачнецца. *А тут из этой санаціи никакого для меня толку нет*, — нэрвова скончыў ён, перад тым азірнуўшыся на ўсе бакі.

Разьвітаўшыся, я хутка дабег да шаўца, і пакуль той мерыў маю левую нагу ў мокрай шкарпэтцы, я сабе ціхенька падумваў, што ня мне аднаму цяжка жыць на белым сьвеце.


Цяжка даводзіцца нават і „дзеячом" з усімі быўшымі тытуламі:

— Здрада! — крычаць —
— Нічога тут ня зробіш!...
Ну, і пэўна што так!

Прадзёр ужо вочы селянін і ведае, хто чаго варт.

Picolo.

Гэй, смалі, страляй „Маланка!..



Газэтчыкі крычаць: — Купляйце „Маланку“, чытайце „Маланку“, „Маланка“ — сьмешыць, „Маланка“ — цешыць; не шкадуйце-ж трыццаць грошай для „Маланачкі“ харошай!

Сумленьне.

Пасьвядчаецца ўсім кандыдатам у паслы да польскага Сойму, пачынаючы ад эндэкаў і канчаючы пэпээсамі, вызваленцамі і... сельсаюзьнікамі.

„Маланка“.

— Хто вы такі?

— Кандыдат у паслы да Сойму.

— Але-ж не, я пытаюся, чым вы займаецеся?

— Я-ж вам кажу, што кандыдат у паслы!

— І вам ня сорамна?

— Чаму?

— Ды так, наагул, ня сорамна?

— Але-ж чаго мне мае быць сорамна?

— Ды вы ня выкручвайцеся — паглядзеце мне проста ў вочы і адказвайце: вам ня сорамна?

— Я, нічога... не разумею..

— Ды што вы мне кажаце! Пры чым тут „разумею, ці не разумею“, вы мне толькі скажэце: вам ня сорамна?

Маўчаньне.

— Ну?

— Што?

— Чаму-ж вы не адказваеце?

— Але што я маю вам казаць?

— Вам ня сорамна? Вы толькі прызнайцеся адкрыта: вам сорамна, ці ня сорамна?

— Маўчаньне.

— Але, сорамна!

— Даўно-б гэта сказалі.

Абое цяжка ўздыхаюць і расходзяцца.

Ave.

П э ў н ы.

Паліцыянт спаткаў незнаёмага і думаў, што гэта камуністы:

— Стой!.. *Рэнцэ до гуры!* — я павінен вас зрэвідаваць...

— Дарэмная праца! перад выхадам з хаты мяне дасканальна жонка зрэвідавала.

СЯРОД б. ПАСЛОЎ „ВЫЗВАЛЕНЦАЎ“.

(*З падслуханых гутарак*).

— А ведаеш што, пакуль ня быў паслом, дык меў толькі сумленьне, а больш нічога, а цяпер маю фальварак, даляры ў банку, краму ў мястэчку, але... сумленьня ня маю.

— Пляваць на сумленьне! Я яго ад маленства ня маю, а ўжо два разы паслом быў і цяпер трэцьці раз у Сойм папасьці спадзяюся...

ЛІТЭРАЛЬНА ЗРАЗУМЕЎ.

Муж скардзіцца жонцы:

— Ліха ведае, што гэта за час такі, ніяк на грошы разжыцца ня можна...

— А што трэба зрабіць, каб мець грошы? — пытае шасьцёхгадовы сынок.

— Трэба быць разумным, працавітым і шмат чаго ведаць, — навучае бацька.

— А ці-ж тата дурны, гультай і нічога ня ведае?!

М.

МУЖЫЧОК — ДУРАЧОК, ЗНАИ НЕ ЗЯВАЙ, МЯНЕ Ў СОИМ ВЫБІРАЙ!

Наш Ярэміч дэпутат
„Соцыяльны-дэмакрат“
Заклікае ўсіх сялян
Падрываць рабочы стан.

— Бо работнік, — кажа ён, —
З намі спрэчны ад давён,
Хоча вызваліцца сам,
А ня даць нічога нам.

Дый работнікаў няшмат
З беларускіх вышла хат,
Ці-ж яны змагуць, паслоў,
Нас у Сойм пасляць ізноў,
Даць нам цёпленькі мандат!

Без мандату-ж, як бяз рук,
Проста выляціш на брук,
А тады хоць памірай,
Дык сялянства: — „выбірай“!

Ты-ж вось гэтка „Грамада“,
І з табою не бяда
Ў моцны зьвязвацца „Саюз“,
Каб Ярэміч мог быць — туз,
Раздабрэць, як той гарбуз.

Шаснаццаты.

ПАДСЛУХАНАЯ ГУТАРКА.

— Чым вы цяпер займаецеся?
— Правакатурай.
— На пэнсіі?
— Не, так, ад штукі.

ПАКАЗАЎ НА ДЗЬВЕРЫ.

— Запрапанаваў я нашаму камэнданту хабара, дык ён мне на дзьверы паказаў...

— Няўжо выгнаў?

— Не... Проста даў зразумець, што там за дзьвярыма могуць нас падслухаць.

Р. Г.

У ХМАРНУЮ ПАГОДУ.

— Што вы можаце сказаць пра сонечную сыстэму?

— Сыстэма — добрая, але выканаўцы кепскія.



I. ЦІКАВЫ.

Што казаў дзед Піліп пра радыё?

Мы грамадой абступілі дзеда Піліпа і з захопленьнем апавядалі яму пра над'звычайныя поступы, якія робіць радыё.

— Зразумейце сабе, дзядуля, можна слухаць сьпевы з Бэрліну, Лёндану, Жэнэвы, навет з Нэў-Ёрку!

— Эт, глупства! — махнуў рукой стары Піліп.

— Можна слухаць музыку, лекцыі... Як наставіш на галасьнік, дык куды там грамафон!.. Далёка яму да радыё!.. Лепш чутно... выразьней!..

— Гэта не для нас, — зяўнуў стары дзед. — Для нас трэба чагось іншага!..

— Ну, ведама, дзядуля ня скача, сьпевы яго ня цікавяць...

— Ды ня тое зусім вы кажаце, дзеці. Вам маладым усё сьпевы ды скокі ў галаве, а пра гаспадарку ня думаеце... Радыё можа прыдацца і ў гаспадарцы... Вясной, напр., вароны насеньне з зямлі выдзёўбваюць... Прыйдзе лета, вераб'і жыць не даюць, вішні пааб'ядаюць, у збожжа ніштараць, абіваюць... А вось каб схаваць у жыце некалькі гэтых галасьнікоў, ды каб яны ў адзін голас закрычэлі: а кыш!.. а кыш!.. А пасьля зноў і зноў... Магу залажыцца, што ніводзін верабей не заглянуў-бы ў жыта...

Або папрывязваць вось гэтыя вашыя галасьнікі на вішнях, а пасьля стрэліць на надаўчай станцыі з гарматы... Па ўсім садку: трах та-р-р-р-а-рах, а пасьля зноў і зноў... Хіба-ж пасьля гэтага хоць адзін верабей адважыцца навет паглядзець на вішню? Ці хіба хоць адзін вісус адважыцца тагды зьбліжыцца да яблыні? Але, але, радыё гэта — добрая рэч... — казаў дзед Піліп, а мы слухалі і маўчалі...

Ці ня мае ён слушнасьці?

(*З украінскага*)

Я. М.



НАШЫ РЭЦЭПТЫ.

ЯК ЗРАБІЦЬ МУЖЧЫНУ.

Бярэцца пара ботаў, адны шкарпэткі, лепш у паскі, кашулю таксама ў паскі, сіні гарнітур, гальштук, калёру марской хвалі... і ўсё.

— А самае галоўнае?

— Самае галоўнае вусы, але... іх можа і ня быць.

ЯК ЗРАБІЦЬ ЖАНЧЫНУ.

Жанчына робіцца зусім проста — : бярэцца „бюстгальт“, паўкіля ваты, шырокая сукенка, парык, капялюш а'la вазон, пэрлы (могуць быць і фальшывыя) у вушы, элегантная торбачка.

— А ў сярэдзіне што?

— Мякіна і ўсякае сьмяцьцё.

ЯК РОБІЦЦА КАХАНЬНЕ.

Каханьне ня робіцца; яно валіцца на галаву, як дождж і нарабіўшы бруду выпарваецца.

ЯК РОБІЦЦА КАР'ЕРА.

Трэба рабіць масаж сьпіны аж да поўнага яе схіленьня ўніз, да гэтага дадаць разьвіцьцё мускулаў — каб імі можна было сільна націскаць патрэбныя для гэнае аказіі пружыны; адсутнасьць асабістага гонару і як найбольш аплёмбу.

ЯК РОБІЦЦА ШЧАСЬЦЕ.

Яно ніяк ня робіцца, бо... яго няма.

ЯК РОБІЦЦА ПАСОЛ.

Бярэцца моцнае горла, да яго прывязваецца вёрткі, як верацяно, язык, дадаецца кругленькі жывоцік. На час выбараў накладаюцца лапці і кажух, а пасьля выбараў лякеркі і фрак.

— А галоўнае што?

— Галоўнае — вялікая, як лапата лапа, каб мог добра заграбаць дыеты.

ЯК РОБІЦЦА ПАДПІСЧЫК.

Бярэцца „przekaz pocztowy“, пішацца на аднэй старонцы яго: Рэдакцыя „Маланка“, Вільня, Гэтманская вул., № 4, а з боку свой адрэс. Зьверху пішацца, колькі высылаецца грошай (8 зл. на год, 4 зл. — на паўгода і 2 зл.—на тры месяцы). На другой старонцы з боку пішацца на што высылаюцца грошы і на які час.

— А галоўнае што?

— Галоўнае, — каб падпісчык не чакаў напамінаньня аб падпісцы, а сам прысылаў яе акуратна.

ДЗЯЦІНАЯ РАДАСЬЦЬ.

— Татка, ці-ж гэта праўда, што ты запісаўся ў пажарную каманду?

— Праўда, маё дзіцятка.

— Ой, як я рад! Дык гэта цябе будуць хаваць з музыкай.

НЕ МАГЛА ВЫТРЫВАЦЬ.

На хаўтурох адзін кажа:

— Гэтак раптоўна памёр і пакінуў маладую жонку, усяго дваццацёх пяцёх гадоў.

— Выбачайце, мне ўсяго дваццаць два гады, — адказала з запалам плачучая жонка.

ЧУЛАЯ ВАГА.


— Скажы мне, Янка, няўжо я важу пяць пудоў?

— Зусім магчыма, характар у цябе вельмі цяжкі.

Перад працэсам „Грамады“.

У канцы люгага мае адбыцца судовы працэс „Грамады“, на які будзе паклікана 56 абвінавачаных і каля паўтысячы сьведкаў.

(З газэт)



Віленская Фэміда*): Калі хто і заслужыў на мэдалю, дык толькі я! Столькі абвінавачаных і столькі сьведкаў у адным працэсе — гэта праца мая, а ня жартачкі! А той Обст, каб яму язык спух, усьцяж кажа, што беларусаў няма...

НАША ПОШТА.

Ад рэдакцыі: Высокапаважаныя падпісчыкі, чытачы і сымпатыкі „Маланкі“ чынна адклікнуліся на заклік наш дапамагчы матар'яльна нашай часопісі. У працягу двох тыдняў мы прыдбалі не малы лік новых платных падпісчыкаў. Рэдакцыя наша пацяшае сябе надзеяй, што і надалей лік падпісчыкаў „Маланкі“ з кожным днём будзе ўзрастаць і хутка дайдзе да такой лічбы, што рэдакцыя выпутаецца з грашавых труднасьцяў і зможа акуратна і часта выпускаць сваю часопісь, па магчымасьці тры, або чатыры разы ў месяц.

Дык хай кожны сьвядомы беларус, ня гледзячы, да якой палітычнай партыі належыць, хай палічыць сваім абавязкам падпісацца на адзіную ў Заходняй Беларусі гумарыстычную часопісь!

У інтарэсе самых падпісчыкаў просім пісаць свой адрэс выразна, дакладна і падаваць назоў бліжэйшай пошты.

Бзд—ку: Выдумайце сабе іншую, больш прызваітую мянюшку (псэўдонім). Жарты прысылайце.

Дубадзеду: Верш свой пачынаеце так:

„Маланку“ я люблю бяз меры,
Я ёй гатоў усё аддаць...

Ня трэба нам Вашага „ўсяго“. Прышлеце падпіску і... нам хопіць!

Лінеў—му: На Вас мы крыўдзімся. У вершы сваім Вы пішаце:

...Сваёй мілай, каханай дзяўчыне
Падарункаў я многа куплю...

Грошы на падарункі маеце, а нам пісьмы бяз марак прысылаеце і навет другі раз!

*) *Фэміда* — багіня правасуднасьці ў старажылых грэкаў.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Гэтманская вул., № 4
«МАЛАНКА»

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

на 1 год 8 злот.
„ паўгода 4 „
„ тры мес. 2 „
„ адзін м. 1 „

За граніцу: на год — 2 даляры, на паўгода — 1 д. на 3 мес. — 50 цэнт.

Рэдактар **М. Луцэвіч**. — Выдавец: **Я. Маразовіч**. Друкарня Б. Клецкіна, Вільня.